УДК 94 (476)

# Беларускі куток на Украіне: мінулае і сучаснасць

Арбузаў А.Ц., Лойка Т.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

У мястэчку Дуброўна Магілёўскай губерні (зараз г. Дуброўна Віцебскай вобласці) ў 1786-1794 гг. дзейнічала суконная мануфактура графа Пацёмкіна Р.А.. У1791г. ён памёр, і яго прадпрыемства Екацярына II выкупіла ў казну Расіі. У 1794г. па яе Указу Дубровенская мануфактура, на якой працавалі 300 чалавек прыгонных, як і шаўковапанчошная Маскоўская, былі перавезены на украінскую зямлю і размешчаны ў карпусах Екацярынаслаўскай фабрыкі.

Працаўнікоў фабрык спачатку размеркавалі сярод сямей мясцовага насельніцтва вёскі Слабада Сурская. Як і мясцовых усіх прыезжых прыпісалі да тамашняй падсобнай фабрыкі па ачыстцы воўны, цяжкія цюкі якой затым адпраўлялі ў Екацярынаслаў. Так тры славянскія народы – рускі, беларускі і ўкраінскі сталі працаўнікамі Екацярынаслаўскай ткацкай фабрыкі агульнай колькасцю каля двух с паловай чалавек. Працу на мясцовай фабрыцы прыезжыя спалучалі з сельскагаспадарчай дзейнасцю. Умовы жыцця на новым месцы былі вепьмі цяжкімі.Частыя засухі, голад, недахоп паліва, цяжкая праца на палях і фабрыцы ўсё часцей станавіліся прычынамі несвоечасовай смерці многіх з іх. Аднак вярнуцца зноў на радзіму было немагчыма.

С цягам часу вёска Слабада Сурская стала называцца Слабада Сурска-Літоўская. У гэтай назве адлюстроўваўся нацыянальны склад сяла – былых жыхароў беларускай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага. Працавалі з цямна да цямна, спачатку на фабрыцы, а затым у сябе вакол дома земляробчай справай. У вольны час спявалібеларускія песні. Разам з родным словам яны служылі доказам свайго этнаграфічнага аблічча.

Працаўнікі Сурска-Літоўскай Слабады пазней прымалі актыўны удзел у рэвалюцыйных падзеях пачатку XX стагоддзя, у будаўніцтве новага савецкага сацыялістычнага грамадства.Удзельнічалі ў барацьбе супраць нямецка-фашісцкіх захопнікаў.

У наш час у патомкаў дубровеншчыны ў многіх у пашпарце у графе "нацыянальнасць" стаіць запіс "беларус". Не страцілася на крутых паваротах гісторыі беларускае "зернятка", моцныя карані пусціла яно на украінскай зямлі і стала вясомым коласам на ніве Прыдняпроўя пад шчырым сонцам нашай агульнай планеты Зямля. Працягваюцца дружалюбныя адносіны жыхароў Сурска-Літоўскай Слабады з насельніцтвам дубровеншчыны і з кожным годам умацоўваюцца.